што была для яго «промнем святла паміж быццём і небыццём» [2, с. 130], нават пасля таго, як 17 сакавіка 1995 г. яе не стала, захоўваў урну з прахам дома, чакаючы часу з'яднання. Пачуццём непапраўнай трагедыі, вялікай страты і непазбыўнай адзіноты поўняцца радкі аднаго з апошніх твораў «На саракавы дзень», датаванага 2 чэрвеня 1995 г.: «Разліта горкая горыч / Па чарках. / Здаецца, ўсе сабраліся / Ля тваёй урны. / Толькі няма цябе, / Хоць кожны дзень / Клічу / І чакаю, каб ты хоць / Адклікнулася» [2, с. 336].

Нацыянальны класік, што некалі ўварваўся ў літаратуру пад гучным і ваяўнічым псеўданімам, зрабіў сапраўды рэвалюцыйныя змены ў развіцці беларускай паэзіі, узняў яе на новы ўзровень мастацкага спасціжэння быцця. Адно з яркіх сведчанняў чаму – дасканалыя ў змястоўна-фармальных адносінах творы Максіма Танка на тэму кахання.

### *ЛІТАРАТУРА*


1. Арочка, М. М. Максім Танк / М. М. Арочка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. – Мінск, 1999–2015. – Т. 3 : 1941–1965. – 2002. – С. 312–348.
2. Танк, М. Збор твораў : у 13 т. / М. Танк / НАН Беларусі, Ін-т літаратуры імя Я. Купалы. – Мінск : Беларус. навука, 2006–2012. – Т. 6 : Вершы (1983–1995). – 2008. – 454 с.


*Зылевіч Д. П. (Мінск, Беларусь)*

## СУЧАСНЫ РЭПЕРТУАР ДЗІЦЯЧЫХ ВЫДАННЯЎ У БЕЛАРУСІ

Сучасны рэпертуар выданняў, адрасаваных дзецям і прадстаўленых на беларускім кніжным рынку, настолькі разнастайны, што дзецям і іх бацькам разабрацца ў ім дастаткова складана. Мэта дадзенага артыкула – даць агульную ацэнку рэпертуару дзіцячых выданняў з акцэнтам на сучасных тэндэнцыях. Аб'ектам даследавання сталі кнігі, выдадзеныя як у нашай краіне, так і ў Расіі.

За гады развіцця кнігавыдання для дзяцей традыцыйна склалася, што для гэтай катэгорыі чытачоў выпускаюць літаратуру даведачную, навукова-папулярную, вучэбную, рэлігійную, для вольнага часу і мастацкую. Даведачныя, навукова-папулярныя, вучэбныя выданні і выданні для вольнага часу дзяцей вельмі шырока прадстаўлены на беларускім кніжным рынку. Рэпертуар у гэтым сегменце рынку адпавядае запатрабаванням чытачоў, дэманструе магчымасці сучаснай паліграфічнай прамысловасці і прапануе варыянты выданняў у розным цанавым дыяпазоне для дзяцей цяпер ужо ад нуля да 17 гадоў. Для тых, каму яшчэ ад нараджэння няма і года, выпускаюцца развіццёвыя карткі і кнігі. Напрыклад, праект «Школа семи гномов» расійскага выдавецтва «Мазаіка-сінтэз» прадстаўляе сабой па 12 маляўніча праілюстраваных выданняў на кожны год жыцця дзіцяці ад нараджэння да паступлення ў школу. А выдавецтва «Росмэн» прапануе кніжкі-цацкі (кніжкі з тэрмометрам, кніжкі з акенцамі, кніжкі-пазлы і інш.) і асобныя серыі для самых маленькіх чытачоў (пакуль яшчэ слухачоў), напрыклад, серыя «Всё-всё-всё для малышей».

На сённяшні дзень найбольш даследаваны тып літаратуры – мастацкая, найменш даследаваны – рэлігійная. Паколькі менавіта ў гэтых тыпах літаратуры адбыліся заўважныя змены, ахарактарызуем літаратурна-мастацкія і рэлігійныя выданні больш падрабязна.

Дзіцячая мастацкая літаратура дастаткова кансерватыўная, асабліва тая яе частка, якая адрасавана чытачам дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Для гэтай катэгорыі чытачоў кнігі выбіраюць бацькі, а яны прапануюць дзецям тое, што чыталі некалі самі, кнігі, у якасці якіх яны ўпэўнены. Таму выдаўцам вельмі цяжка прасоўваць на кніжным рынку творы маладых аўтараў, і таму так многа ў нашых кнігарнях класічных ці проста вядомых твораў – яны гарантавана раскупяцца. І адукацыйныя праграмы па літаратуры ў нас вельмі кансерватыўныя.



Тым не менш, назіраюцца станоўчыя змены. Сучаснымі беларускімі аўтарамі напісаны цікавыя казкі, многія з іх склалі серыю «Казкі XXI стагоддзя» (выдавецтва «Мастацкая літаратура»). Сённяшнія аўтарскія казкі прапануюць новыя тэмы і новых герояў, у параўнанні, напрыклад, з народнымі творамі. Народныя казкі ў асноўным пра мужыкоў і паноў, пра сельскагаспадарчы цыкл, пра нялёгкую працу ці пра складаныя ўзаемаадносіны з традыцыйнымі міфічнымі персанажамі. Усё гэта вельмі далёка ад сучасных дзяцей. Нашы аўтары сёння прапануюць адправіцца ў падарожжа з пані Чаротнай (А. Масла «Як пані Чаротная на госці ў Палангу бегала»), даведацца пра прыгоды маленькай машынкі (Н. Бучынская «Прыгоды маленькай машынкі»), пра тое, чаму звычайная затока можа змяніць колер (П. Васючэнка «Каляровая затока»), ці паразважаць над лёсам сумнага супа (В. Гапеева «Сумны суп»). Тэматыка твораў надзвычай разнастайная.

З'яўляюцца і больш крэатыўныя выданні, адрасаваныя як дзецям, так і дарослым. Прывядзём у прыклад кнігу вершаў А. Хадановіча «Нататкі таткі». На думку паэта, усе дзіцячыя вершы, што яму траплялі ў рукі, былі занадта правільныя, з відавочнай мараллю і нецікавыя. А аўтару хацелася зрабіць лёгкі «дзіцячы панк», напісаць вершы на любы выпадак жыцця, якія б лёгка ўспрымаліся на слых і адпавядалі рэаліям дзіцячага жыцця [1]. Гераіня кніжкі дзяўчынка Аленка корміць качак, збірае каштаны, катаецца на каньках і веласіпедзе, устройвае патоп у ванне, угаворвае бацькоў купіць ёй новы капялюш, едзе з дзедам па грыбы… Разам з ёю маленькі чытач шкадуе, што мама не мяняе боршч на цукеркі, даведваецца аб правілах паводзін на батуце і асэнсоўвае складаны рэжым дня першакласніка: «У мяне бацькі – звяры! / Абуджаюць на зары, // Кожны ранак чысціць зубы / Прымушаюць, душагубы! // На сняданак – пяць хвілін, / І ляцім у школу, блін!».

Ёсць у кнізе пласт зместу, даступнага толькі бацькам. Разважанне аўтара пра рыпенне арэляў зразумелае ўсім, хто часта гайдае на арэлях сваіх дзяцей. Пошукі адказу на складаныя дзіцячыя пытанні (Чаму агуркі калючыя? Чаму шкарпэткі не шкарпяткі?) з цікавасцю ўспрымаюцца мамамі і татамі трох-, чатырохгадовых сыноў і дачок.

Афармленне кніжкі, выкананае мастачкай Наталіяй Кійко, таксама ў поўнай меры можа быць ацэнена дарослымі, хаця малюнак крыху нагадваюць дзіцячыя. Яны стыльныя, сумяшчаюць пэўную прымітыўнасць і складаныя дэталі, арыгінальна размешчаны на старонках, гарманіруюць са шрыфтавым афармленнем выдання.

Універсалізацыя чытацкага адрасу (арыентацыя і на дзяцей, і на дарослых) – адна з сучасных тэндэнцый у галіне мастацкай літаратуры. Сярод іншых тэндэнцый адзначым пазнавальную накіраванасць кніг; пашырэнне рэпертуару выданняў для падлеткаў; серыйнасць літаратуры; павелічэнне колькасці перакладных выданняў і выданняў філасофскай, экзістэнцыяльнай накіраванасці; павышэнне культуры рэдакцыйна-выдавецкай падрыхтоўкі кніг і інш. Актыўнае развіццё мастацкай літаратуры сёння патрабуе асобных грунтоўных даследаванняў па розных кірунках.

Увагу прыцягвае і такі самастойны мастацка-графічны жанр, як комікс. Сёння дастаткова шмат прыхільнікаў выданняў, дзе малюнак з'яўляецца «кнігаўтваральным» элементам – «Дзікае паляванне» (паводле У. Караткевіча), пластылінавы комікс А. Кудрыцкага «Прыгоды Капітана Танакі», кніга С. Мінскевіча «Прыгоды Какоса Маракоса». Попытам у дзяцей карыстаюцца коміксы па матывах папулярных мультфільмаў («Сказочный патруль»).

Асобнага даследавання патрабуе і сучасная рэлігійная літаратура. Значную частку рэпертуару выданняў складаюць кнігі выдавецтва Беларускага Экзархата. Кожны



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

год ім выпускаюцца сотні найменняў кніг духоўна-маральнага зместу. У 2010 годзе гэтае выдавецтва было ўзнагароджана Прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне».

Для дзяцей выдавецтва выпускае Біблію, жыціі, малітвасловы і вялікую колькасць мастацкіх твораў духоўнай накіраванасці. Назавём некалькі серый. Напрыклад, серыя «Святое имя» знаёміць з жыццём святых, чые імёны мы носім (Ілля, Уладзімір, Ганна, Сяргей, Кірыл, Вольга і інш.). У серыі «Солнечный зайчик» сонечны зайчык распавядае пра прыгоды розных жывёл і раслін, пра калядныя і навагоднія цуды. Пры гэтым дзіця спасцігае паняцці сяброўства, дабрыні, сціпласці, любові да родных і блізкіх і атрымлівае інфармацыю пра Бога і асновы хрысціянскай веры.

Асабліва хочацца адзначыць серыю «Град славян». Гэта кніжкі-цацкі, якія ўяўляюць сабой гульню-канструктар (распрацаваў Ф. Е. Боханаў). У дзяцей ёсць магчымасць стварыць з паперы сапраўдны старажытны горад з вежамі, баярскім дваром, млыном, хатамі і цэрквамі ў маштабе 1:72 (кнігі «Угловая башня», «Православный храм», «Деревянная церковь», «Боярский двор» і інш.).

Акрамя серый, выдавецтва Беларускага Экзархата выпусціла вялікую колькасць розных выданняў для дзяцей усіх узростаў. Складальнікам многіх зборнікаў выступіў Б. Ганага. Ёсць выданні для дзяцей малодшага дашкольнага ўзросту – для чытання дарослымі дзецям: «Поделись немножко» Т. Дашкевіч, «Кто поможет двум шмелям», «Улыбнись немножко» А. Радчанковай. У рэпертуары гэтага выдавецтва ёсць таксама зборнікі беларускіх народных казак у пераказе А. Бармуты.

Рэлігійная літаратура і кнігі духоўнай накіраванасці сёння прадстаўлены не толькі ў царкоўных лаўках, але і ў кнігарнях і бібліятэках.

І напрыканцы адзначым яшчэ адну групу выданняў, якая з’яўляецца паказчыкам менавітага нашага часу. Іх можна ўмоўна назваць брэндавымі выданнямі. Гэта комiксы, размалёўкі, кнігі з тэкстам і наклейкамі, ці размалёўкамі, ці рознымі заданнямі. Гэта пераказы сюжэту мультфільмаў ці новыя гісторыі пра персанажаў мультфільмаў. Усе гэтыя выданні аб’яднаны тым, што іх героямі з’яўляюцца медыйныя персанажы-брэнды. У мінулым стагоддзі літаратурныя персанажы пераходзілі ў медыйную сферу, сёння – наадварот. Працытуем Барыса Кузняцова, генеральнага дырэктара выдавецтва «Росмэн»: «Мацнейшыя дзіцячыя брэнды маюць усё ж такі медыйную аснову: «Маша і Мядзведзь», «Смяшарыкі», Winx і г.д. Ёсць брэнды, якія прыходзяць з цацак – Барбі, My Little Pony, трансформеры. За імі стаяць сур’ёзныя рэкламныя бюджэты і ліцэнзійныя каманды буйнейшых сусветных кампаній. Кніжнікі ў гэтай схеме выступаюць набывацелямі правоў, разам з тэкстылем, харчовай індустрыяй, сувенірамі і інш.» [2, с. 14].

Да літаратуры такія выданні часта маюць ускосныя адносіны, але ствараюць сур’ёзную канкурэнцыю іншым літаратурным выданням. Іх любяць сучасныя дзеці. Ім адводзяцца асобныя стэлажы ці паліцы ў кнігарнях, супермаркетах і дзіцячых магазінах.

Такім чынам, сучасны рэпертуар выданняў для дзяцей адрозніваецца вялікай разнастайнасцю. Па-ранейшаму актыўна выдаецца даведачная, вучэбная, навукова-папулярная літаратура ў розным цанавым дыяпазоне. Гэтыя тыпы літаратуры дазваляюць прадэманстраваць узровень развіцця паліграфічнай прамысловасці і лічбавых тэхналогій (кнігі і часопісы з дадаткамі на дысках, выкарыстанне ў выданні тэхналогіі дадатковай рэальнасці і інш).

Змяняецца статус мастацкай літаратуры, цяпер гэта адзін з відаў мастацтва, неабавязкова вядучы. Гэта зразумела па тым, як зменшыліся тыражы. Літаратурна-мастацкія выданні сталі больш крэатыўнымі, нярэдка арыентаванымі і на дзяцей, і на дарослых. Ілюстратары дэманструюць розныя стылі афармлення, адрозныя ад рэалістычных малюнкаў ілюстратараў савецкай школы.



Актыўна развіваецца рэлігійная літаратура. Акрамя традыцыйных Бібліі, малітвасловаў, жыцій, выдаюцца пазнавальныя творы (аб правілах паводзін у храме, аб гісторыі абразоў, аб сутнасці рэлігійных святаў) і творы духоўна-маральнай накіраванасці, якія вучаць спасцігаць базавыя маральныя каштоўнасці.

І, нарэшце, прыкметай выдавецкай справы сучаснасці сталі выданні, у цэнтры якіх – брэндавыя персанажы. Гэта выданні розных тыпаў і відаў (кніжныя і перыядычныя; літаратурна-мастацкія і для вольнага часу; кніжкі-цацкі і коміксы), якія ўваходзяць у лінейку брэндавай прадукцыі.

Станоўчым у сучасным стане развіцця кнігавыдання для дзяцей з’яўляецца наяўнасць выбару і функцыянаванне прынцыпу «попыт–прапанова». Адмоўным можна лічыць слабую рэкламу, неразвітасць інстытута літаратурнай крытыкі, у выніку чаго інфармацыя пра многія новыя выданні проста не даходзіць да чытача.

## ЛІТАРАТУРА

1. «Арт-каляндар 2015». «Дзіцячы панк» у кнізе вершыкаў Андрэя Хадановіча «Нататкі таткі» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://news.tut.by/culture/435107.html. – Дата доступу: 21.08.2018.
2. Кузнецов, Б. Разложим по полочкам / Б. Кузнецов // Книжная индустрия. – 2012. – № 4. – С. 13–15.

*Іконнікава Л. У. (Мінск, Беларусь)*

## БЫТ І БЫЦЦЁ Ў «МАЛАДОЙ» ПОЛЬСКАЙ ПРОЗЕ

Мяжа 80–90-х гадоў XX стагоддзя ў польскай літаратуры – час уваходжання ў мастацкую прастору і ўласна «маладой прозы», і досыць позніх і «сталых» празаічных дэбютаў пісьменнікаў, і, нарэшце, набыццё дэбютантамі 1980-х гадоў «другога дыхання». У другой палове 1990-х заявіла аб сабе і пакаленне тых, хто нарадзіўся ў 1970–1980-я. Тым не менш, можна заўважыць, што яны не надта дыстанцыраваліся ад бліжэйшых папярэднікаў, адрознівае іх хіба што сур’ёзна паднятая тэма наркотыкаў, трохі большая цікавасць да польскіх рэалій і болей актыўнае выкарыстанне моладзевага слэнгу.

Старэйшая літаратурная генерацыя, чый мастацкі вопыт служыў пэўным мосцікам паміж сучаснасцю і заходнебеларускім дваццацігоддзем, пакінула літаратурную авансцэну. Сярэдняе пакаленне празаікаў знаходзілася не ў лепшай форме, а проза дэбютантаў 1980-х гадоў, па сутнасці, так і засталася незаўважанай. Такім чынам маладыя празаікі атрымалі яшчэ адну перавагу: адсутнасць сур’ёзнай канкурэнцыі.

Усведамленне чалавекам сябе як асобы становіцца кропкай перасячэння шматлікіх сацыяльных сувязей, праз якія яна ўпісваецца ў рэальны соцыум і культурны кантэкст і ў дачыненні да якіх ўсведамляе сябе. Такое асэнсаванне заўсёды пачынаецца з бачання сябе ў прасторы і часе і праходзіць у гэтых каардынатах жыцця і свядомасці.

Вопыт жыцця большасці маладых польскіх пісьменнікаў – пераважна гарадскі, таму заканамерна, што і прастора, якую яны абжываюць у сваёй прозе, рэзаніруе на ўрбанізм як умову жыцця і яе якасць. Для твораў характэрны крытычны погляд, які ўзыходзіць да рамантызму, на мегаполіс і цывілізацыю, што сімвалізуе горад. Увасабляецца гэта, у першую чаргу, у прозе К. Варгі, А. Стасюка, В. Такарчук, Г. Кавалеўскай, П. Гюле, С. Хвіна, Г. Струмыка, З. Рудзкай, у творах якіх горад успрымаецца героямі як прыгнятальнік, які выступае сімвалам дэградацыі ўсяго сучаснага жыцця, што рэалізуецца праз усведамленне пачварнасці, безаблічнасці гарадскога пейзажу. Стаўленне персанажаў да прасторы неадназначнае: з аднаго боку, выяўляецца нянавісць да сваёй, засвоенай прасторы, якая прыніжае іх у сацыяльнай іерархіі ася-



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ